**В. К. Красько[1], Г. М. Канцавая[2]**
[1]ДУА «Сярэдняя школа № 13 г. Брэста імя В. І. Хована»
[2]УА «БрДУ імя А. С. Пушкіна»

# УЗБАГАЧЭННЕ ФРАЗЕАЛАГІЧНАГА ЗАПАСУ ВУЧНЯЎ І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ МАРФАЛОГІІ

З мэтай узбагачэння фразеалагічнага запасу вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі працу над устойлівымі моўнымі адзінкамі неабходна праводзіць і пры вывучэнні марфалогіі. Вывучэнне назоўніка, прыметніка, дзеяслова дае магчымасць для практычнага знаёмства малодшых школьнікаў з назоўнікавымі, прыметнікавымі і дзеяслоўнымі фразеалагізмамі. Неабходна адзначыць, што ў пачатковых класах не даецца тэарэтычных звестак пра структурна-граматычныя тыпы фразеалагізмаў, аднак практычная праца з фразеалагізмамі, назіранні над імі фарміруюць у вучняў паняцце пра форму, структуру і семантыку фразеалагічных адзінак.

Пры вывучэнні назоўніка, прыметніка, дзеяслова настаўніку мэтагодна паказаць малодшым школьнікам на прыкладах, што абазначаць «прадмет і адказваць на пытанне *што? хто?*», «прымету прадмета і адказваць на пытанні *які? якая? якое? якія?*», «дзеянне і адказваць на пытанні *што рабіць? што зрабіць?*» могуць не толькі асобныя словы, але і ўстойлівыя словазлучэнні, якія абазначаюць адно паняцце.

Прывядзём прыклады работы над фразеалагізмамі розных структурна-граматычных тыпаў у пачатковых класах пры вывучэнні марфалогіі беларускай мовы.

*Назоўнік*

На ўроках настаўнік знаёміць малодшых школьнікаў з незвычайнымі, «чарадзейнымі» фразеалагізмамі, якія, як і адушаўлёныя назоўнікі, адказваюць на пытанне *хто?* Настаўнік называе іх «чарадзейнымі» таму, што яны не толькі абазначаюць асобу, але і даюць станоўчую ці адмоўную ацэнку яе маральным якасцям. Пры працы з фразеалагізмам разглядаецца яго форма, значэнне і выкарыстанне ў маўленні, даецца яго эмацыянальна-ацэначная характарыстыка, указваюцца (калі ёсць) блізкія і/ці супрацьлеглыя па значэнні фразеалагізмы, прыводзяцца звесткі з гісторыі ўзнікнення ўстойлівай адзінкі. Арганізаваная такім чынам праца над фразеалагізмам дае магчымасць настаўніку фарміраваць у вучняў пачатковых класаў не толькі прадметныя, але і агульнакультурныя кампетэнцыі, рашаць як адукацыйныя, так і выхаваўчыя задачы.

Для тлумачэння значэння фразеалагізма выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы: разгорнутае апісанне (*замарыць чарвячка* – злёгку перакусіць,

спехам прагнаць голад), замена лексічным сінонімам (*збіваць з панталыку* – заблытваць), падбор фразеалагічнага сіноніма (*зрываць маску* – *выводзіць на чыстую ваду*), выкарыстанне слоўніка (*хапаць на ляту* ’разумець, засвойваць адразу, лёгка і хутка’), знаходжанне пададзеных да фразеалагізмаў у адвольным парадку гатовых тлумачэнняў, падбор фразеалагічнага антоніма (*з пятага на дзясятае* – не пакладаючы рук), акрэсліванне значэння фразеалагізма па малюнку і інш.

Звесткі пра паходжанне розных структурна-граматычных тыпаў фразеалагізмаў не толькі ўзбагачаюць веды вучняў, але і выклікаюць цікаўнасць, садзейнічаюць развіццю назіральнасці, павышаюць цікавасць як да беларускай мовы і яе гісторыі, так і да гісторыі беларускага народа, яго культуры, трады-цый і звычаяў.

Да назоўнікавых фразеалагізмаў адносяцца такія фразеалагізмы, як *стрэляны верабей* ‘вельмі вопытны, спрактыкаваны чалавек’, *ранняя пташка* ‘дбайны, руплівы чалавек, які рана ўстае ці раней за іншых прыходзіць куды-небудзь’, *залётная птушка* ‘чужы, нетутэйшы чалавек’, *важная пташка* ‘чалавек з высокім становішчам, званнем, пасадай’, *вольная птушка* ‘свабодны, ні ад каго незалежны чалавек’, *птушка высокага палёту* ‘чалавек, які займае высокае становішча ў грамадстве’, *жаўтаротае птушаня* ‘вельмі малады, нявопытны, наіўны чалавек’, *воўк у авечай шкуры* ‘каварны, крывадушны чалавек’, *малая сошка* ‘нязначны, малаважны, неўплывовы чалавек’ і інш.

Пры працы з фразеалагізмамі вучні акрэсліваюць значэнне фразеалагізма, прапануюць свой малюнак, высвятляюць гісторыю паходжання ўстойлівай адзінкі, паказваюць яе выкарыстанне ў тэксце ці маўленні, звяртаюць увагу на маральную якасць, названую фразеалагізмам, акрэсліваюць яго ацэнку і эмоцыі, якія ўзнікаюць (напрыклад *пуп зямлі* – саманадзейнасць, зазнайства; выклікае эмоцыі неадабрэння, пагарды, знявагі, іроніі), падбіраюць блізкія па значэнні фразеалагізмы (калі ёсць).

У якасці дамашняга задання можна прапанаваць вучням знайсці ў фразеалагічным слоўніку і выпісаць, напрыклад, па 2 фразеалагізмы-назоўнікі, у склад якіх уваходзяць словы-кампаненты, якія абазначаюць чалавека па роднасці, сацыяльным становішчы, родзе заняткаў, частку чалавечага цела, нябёснае цела, міфалагічную істоту і інш. Складанасць задання заключаецца ў тым, што фразеалагізмы павінны характарызаваць тую ці іншую маральную якасць чалавека. Пры праверцы задання вучні называюць значэнне знойдзенага фразеалагізма і маральную якасць, зафіксаваную ў фразеалагічнай адзінцы (*зорка першай велічыні* ‘вельмі славуты ў якой-небудзь сферы дзейнасці чалавек’ (адабральны); *залатыя рукі* ‘вельмі ўмелы і здольны ў сваёй справе чалавек’ (адабральны); *узыходзячая зорка* ‘чалавек, які пачынае набываць шырокую вядомасць,

вялікую сілу ў якой-небудзь галіне дзейнасці’ (адабральны); *пудзіла агароднае (гарохавае)* ‘смешна, непрыгожа ці безгустоўна адзеты чалавек’ (неадабральны); *маміна дачка* ‘распешчаная, збалаваная дзяўчынка, дзяўчына’ (іранічны); *злыя языкі* ‘плеткары, паклёпнікі’ (неадабральны); *крывое кола* ‘ўпарты, капрызны чалавек, які сваімі ўчынкамі пляміць сябе’ (неадабральны); *апошняя спіца ў коле* ‘чалавек, які адыгрывае нязначную ролю ў грамадстве, у жыцці, не мае ніякага ўплыву’ (неадабральны); *блудны сын* ‘легкадумны, свавольны чалавек, які раскаяўся ў сваіх памылках’ (неадабральны, іранічны); *мокраяануча* ‘слабавольны, бесхарактарны чалавек’ (пагардлівы); *дабёр бабёр* ’хітры, выкрутлівы чалавек‘ (іранічны); *базарная баба* ’крыклівы, сварлівы, грубы чалавек‘ (неадабральны) і інш.

*Прыметнік*

Пры вывучэнні прыметніка настаўнік знаёміць малодшых школьнікаў з «чарадзейнымі» фразеалагізмамі-прыметнікамі, якія, як і словы-прыметнікі, адказваюць на пытанні *які? якая?*, але ў адрозненні ад слоў абазначаюць не проста прымету прадмета (асобы), а і характарызуюць тую ці іншую маральную якасць асобы.

Вучні пачатковых класаў знаёмяцца з такімі прыметнікавымі фразеалагізмамі, як *пустая галава* ’нездагадлівы, прастакаваты‘ (неадабральны), *лыкам шыты* ‘неадукаваны, прастакаваты’ (неадабральны), *з каломенскую вярсту* ‘вельмі высокі’ (жартаўлівы), *курам на смех* ‘вельмі дрэнны’ (неадабральны), *не кыш-варона* ’спрытны, кемлівы’ (адабральны і неадабральны), *лёгкі на руку* ‘ўдачлівы’ (адабральны), *лёгкі на язык* ‘залішне гаваркі’ (неадабральны), *падшыты лісіцай* ‘вельмі хітры і лжывы’ (неадабральны), *ваўком падшыты* ‘вельмі сярдзіты’ (неадабральны), *як быццам чортам падшыты* ‘хітры і шкадлівы’ (неадабральны), *слоў не пазычае* ‘знаходлівы, дасціпны’ (адабральны), *ад гаршка паўвяршка* ‘вельмі нізкі’ (іранічны), *з мухамі ў носе* ‘вельмі ўпарты, капрызны, наравісты’ (неадабральны), *не мычыць не целіцца* ‘нерашучы’ (неадабральны), *галава варыць* ‘разумны, кемлівы, знаходлівы (адабральны) і інш.

Можна прапанаваць вучням выбраць з фразеалагічнага слоўніка, напрыклад, тры ўстойлівыя параўнанні (фразеалагізмы-прыметнікі), якія змяшчаюць словы-кампаненты з назвамі наступных жывёл: сабака, лісіца, воўк. Настаўнік просіць вучняў задумацца над тым, ці сапраўды жывёлы валодаюць тымі якасцямі, якія ім прыпісвае чалавек і якія атрымалі адлюстраванне ў фразеалагізмах.

*Дзеяслоў*

На ўроках настаўнік знаёміць малодшых школьнікаў з «чарадзейнымі» дзеяслоўнымі фразеалагізмамі, якія, як і словы-дзеясловы, адказваюць на пытанні *што рабіць? што зрабіць?*, але ў адрозненні ад слоў абазначаюць дзеянне ці стан чалавека, характарызуючы яго з маральнага пункту погляду.

Да дзеяслоўных фразеалагізмаў адносяцца такія фразеалагізмы, як *біць лынды* ‘гультаяваць’ (неадабральны), *віляць хвастом* ‘ашукваць, хітраваць, крывадушнічаць’ (неадабральны), *вымотваць жылы* ‘знясільвацца’ (неадабральны), *высмоктваць з пальца* ‘выдумваць’ (неадабральны), *выціскаць сокі* ‘прыгнятаць, эксплуатаваць’ (пагардлівы), ганяць сабак ‘лодарнічаць’ (неадабральны), поўзаць на каленях ‘прыніжацца, дагаджаючы’ (неадабральны), *разводзіць сырасць* ‘плакаць’ (неадабральны), *рваць горла* ‘вельмі моцна крычаць, гаварыць, спяваць’ (неадабральны), *сядзець склаўшы рукі* ‘бяздзейнічаць’ (неадабральны), *хадзіць на галаве* ‘вельмі сваволіць, дурэць’ (неадабральны), *хадзіць на задніх лапках* ‘лісліва дагаджаць, падхалімнічаць’ (неадабральны), *хварэць на пана* ‘доўга спаць, вылежвацца’ (неадабральны), *цягнуць ката за хвост* ‘нудна, аднастайна гаварыць, выклікаючы ў каго-небудзь раздражненне’ (неадабральны), *часаць языком* ‘пустасловіць’ (неадабральны), *абліваць граззю* ‘нагаворваць на каго-небудзь, лаяць, абвінавачваючы ў чым-небудзь’ (неадабральны), *вылятаць у трубу* ‘разарацца, заставацца без грошай’ (неадабральны), *распускаць нюні* ‘плакаць’ (неадабральны), *дурыць галаву* ’знарок падманваць каго-небудзь‘ (неадабральны), *рассыпацца дробным макам* ’лісліва дагаджаць каму-небудзь, паддобрывацца да каго-небудзь‘ (неадабральны), *поўзаць на каленях* ‘прыніжацца, дагаджаючы’ (неадабральны), *гнуць шыю* ‘прыніжацца, угоднічаць’ (неадабральны), *перамываць языком* ‘абгаворваць, бэсціць’ (неадабральны) і інш.

Працуючы над падобнага роду фразеалагізмамі, настаўнік падводзіць вучняў да думкі, што дзеяслоўныя фразеалагічныя адзінкі не толькі характарызуюць дзеянні і ўчынкі чалавека, але і перадаюць яго ўнутраны псіхаэмацыянальны стан, уводзяць у свет хваляванняў і пачуццяў чалавека.

У якасці задання можна прапанаваць вучням выпісаць са слоўніка дзеяслоўныя фразеалагізмы, у складзе якіх ёсць словы-назоўнікі, якія абазначаюць частку цела чалавека (вочы, галава, нага), і размеркаваць іх у два слупкі: тыя, што абазначаюць дзеянні чалавека, і тыя, што абазначаюць псіхаэмацыянальны стан чалавека (марочыць галаву, губляць галаву, замазваць вочы, устаць з левай нагі, надурыць галаву, выплакаць усе вочы, блытацца пад нагамі і інш.).

*Прыслоўе*

На ўроках настаўнік знаёміць вучняў з «чарадзейнымі» прыслоўнымі фразеалагізмамі, якія, як і «застылыя» словы-прыслоўі, адказваюць на пытанні як? якім чынам?, калі? дзе? чаму? і г. д., але ў адрозненні ад слоў абазначаюць прымету дзеяння чалавека, характарызуючы яго з маральнага пункту погляду.

Вучні пачатковых класаў знаёмяцца з наступнымі прыслоўнымі фразеалагізмамі: *спусціўшы рукавы* ‘абы-як (рабіць што-небудзь)’, *як*

*курыца лапай* ’вельмі неразборліва і неахайна‘, *як кот з сабакам* ‘нядружна’, *душа ў душу* ‘вельмі дружна’, *на ўсё горла* ‘вельмі моцна’, *з горам папалам* ‘ледзь-ледзь’, *у хвост і ў грыву* ‘бязлітасна, непрымірыва (біць, лупіць)’, *у хвасце* ‘ззаду’ і інш.

У якасці самастойнай працы можна прапанаваць вучням знайсці ў слоўніку прыслоўныя фразеалагічныя адзінкі са значэннем: 1) хутка (бегчы); 2) многа; 3) мала; 4) блізка.

Даведка: (бегчы) ва ўсе лапаткі, без аглядкі, высалапіўшы язык, з усёй сілы, з усіх ног, на злом галавы, што ёсць духу, як жару ўхапіўшы, як з ланцуга сарваўшыся, як з перуна, як на пажар, як падсмалены; як селядцоў у бочцы, яблыку няма дзе ўпасці, хоць гаць гаці, адбою няма, канца-краю не відаць, цераз край, як сабак нярэзаных; кот наплакаў з вераб’ёў нос, з жабіны прыгаршчы, з камароў нос, кропля ў моры, курам на смех, на пальцах можна пералічыць, з макава зерне; рукой падаць, за два крокі, не за гарамі, пад бокам, пад самым носам, пад рукой.

З мэтай поўнага разумення сэнсу такіх моўных адзінак неабходна ўключаць іх у розныя кантэксты і маўленчыя сітуацыі ў працэсе працы над фразеалагізмамі.

Такім чынам, праца над слоўнікам вобразных выразаў пашырае кругагляд вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, так як фразеалагізмы – гэта крыніца, якая заклікана знаёміць малодшых школьнікаў з фактамі беларускай культуры, гісторыі, народных традыцый.

Знаёмства вучняў з фразеалагізмамі, якія характарызуюць маральныя якасці асобы, спрыяе разумоваму, маўленчаму і эмацыянальнаму развіццю малодшых школьнікаў. Праводзячы з вучнямі працу з фразеалагізмамі, настаўнік пастаянна ўключае дзяцей у актыўную разумовую дзейнасць, прымушае задумацца над значэннем слоў і выразаў, а значыць павышае ўзровень іх мысліцельнай дзейнасці.